чыма пры наяўнасці пэўных ведаў, уменняў і навыкаў. Сярод іх: авалоданне элементарнымі педагагічнымі дзеяннямі і алгарытмамі педагагічнай практыкі; прафесійна-асобаснай матывацыяй, што ўключае ўсведамленне сябе як творцы ў педагагічным працэсе, пазнанне сваіх моцных і слабых бакоў праз аналіз фактаў уласнай педагагічнай дзейнасці, разуменне перспектыў развіцця творчай індывідуальнасці сваёй асобы.

Гэтая ўсвядомленая работа па ўдасканальванні сябе як прафесіянала патрабуе ўмення адаптаваць свае індывідуальна-непаўторныя асаблівасці да патрабаванняў педагагічнай дзейнасці прафесійных "чалавеказнаўцаў", бесперапынна ўдасканальваць творчы, пазнавальны, цэннасна-арыентаваны і мастацкі патэнцыялы сваёй асобы.

Асноўнымі ўмовамі самаадукацыйнай дзейнасці студэнтаў з'яўляюцца, па-першае, маральна-валявая гатоўнасць да такой дзейнасці (індывідуальна-псіхалагічны аспект); па-другое, вучэбна-метадычная гатоўнасць студэнтаў да самаадукацыі (арганізацыйна-метадычны аспект); па-трэцяе, аспект перспектывы, адлюстраваны ў мэтанакіраванасці педагагічнай самаадукацыі, ва ўменнях студэнтаў вызначыць і рэалізаваць перспектывы і бліжэйшыя задачы з мэтай дасягнення якасцей, неабходных у педагагічнай дзейнасці. Толькі адчуванне перспектывы забяспечыць студэнту магчымасць удасканалення прафесійных уменняў і навыкаў у перыяд практыкі.

**Л.А.Ванкевіч,**
**загадчык аддзела**
**Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў г. Мінска**

## ПРАКТЫЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ НА БАЗЕ ПАЛАЦА ЧЫГУНАЧНІКАЎ

У апошні час узрастае значэнне такіх дзелавых якасцей сацыяльнага педагога, арганізатара вольнага часу, як кам-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

петэнтнасць, пачуццё новага, ініцыятыўнасць, гатоўнасць браць на сябе адказнасць, уменне вырашаць творчыя задачы і інш.

З мэтай дасягнення найбольшай паслядоўнасці ў навучанні студэнтаў практычным прыёмам работы ў соцыуме на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці распрацавана методыка правядзення асобных спецыяльных дысцыплін ў пазашкольных установах, у прыватнасці, у палацах культуры, цэнтрах сацыяльна-педагагічнай рэабілітацыі, цэнтрах пазашкольнай работы, дзіцячых аздараўленчых цэнтрах. Так, напрыклад, практычнае навучанне на базе Палаца чыгуначнікаў ахоплівае студэнтаў усіх курсаў спецыялізацыі "сацыяльны педагог" і будуецца на аснове пераносу індывідуальных, дробнагрупавых заняткаў па дысцыплінах "сацыякультурнае праектаванне", "рэкрэацыйная дзейнасць", "забаўляльная дзейнасць" ва ўмовах рэальнага вытворчага працэсу.

Пералічаныя віды заняткаў праходзяць пад кантролем выкладчыкаў-пачасавікоў, якія працуюць у Палацы чыгуначнікаў. Правядзенне практычных заняткаў у такіх умовах — гэта арганічнае злучэнне навучальнага працэсу з практычна-культурнай дзейнасцю Палаца чыгуначнікаў. Варта заўважыць, што такое злучэнне не азначае ўключэння студэнтаў у планавы паток праграм вольнага часу ў якасці дадатковага рэзерву.У час навучання на базе Палаца чыгуначнікаў студэнты засвойваюць новыя тэхналогіі арганізацыі вольнага часу, удзельнічаюць у круглых сталах, якія праводзяць спецыялісты сектара па рабоце з дзецьмі, распрацоўваюць і прапануюць аўтарскія праекты праграм вольнага часу.

Навучанне студэнтаў на базе практыкі дазваляе ім паглыбіць і пашырыць веды, атрыманыя ў вышэйшай навучальнай установе, выпрацаваць неабходныя практычныя навыкі, сцвердзіцца ў прафесійных адносінах. Напрыклад, студэнтамі V курса па дысцыпліне "Сацыякультурнае праек-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

таванне" быў распрацаваны цыкл праграм "Гармонія". Гэты праект уключае тры этапы.

На першым этапе студэнты вывучалі культурныя інтарэсы і запатрабаванні сям'і, высвятлялі праблемы, з якімі сутыкаюцца бацькі, арганізацыю вольнага часу дзяцей.

На другім этапе распрацоўваліся культурныя тэхналогіі вольнага часу для сямей, якія ўключалі: забаўляльныя, інфармацыйна-дыскусійныя праграмы, сямейныя святы і інш.

Методыка правядзення пералічаных праграм будавалася такім чынам, каб прадстаўнікі сям'і (бабулі, дзядулі, бацькі, дзеці) былі не толькі гледачамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі конкурсаў, гульняў, прапаноўвалі парады па сямейным выхаванні дзяцей. Акрамя таго, у праекце "Гармонія" студэнты распрацавалі мадэль Цэнтра дзейнасці для дзяцей, каляндар сямейных свят, неардынарныя сцэнарыі, забаўляльныя праграммы для сям'і. Быў створаны клуб "Маладая сям'я". Праграма яго прадугледжвае сустрэчы маладых з псіхолагам, сацыяльным педагогам, медыцынскімі работнікамі, а таксама з дзеячамі мастацтва Беларусі. Шэраг заняткаў быў прысвечаны арганізацыі адпачынку дзяцей, дарослых у сям'і.

На трэцім этапе пасля практычнай рэалізацыі праекта студэнты разам з выкладчыкам зрабілі аналіз сумеснай працы з улікам пажаданняў сем'яў.

Па заканчэнні быў арганізаваны круглы стол, падчас якога падводзіліся вынікі праведзенай студэнтамі практычнай работы. Акрамя таго, студэнты правялі шэраг забаўляльных праграм у дзіцячым садку, школе, на адкрытых пляцоўках.

Такім чынам, практыка студэнтаў у Палацы чыгуначнікаў стварае ідэальныя ўмовы для фарміравання навыкаў і ўменняў у сферы вольнага часу, работы з дзецьмі, моладдзю, сем'ямі, людзьмі ў сталым узросце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ